Ре

# РЭЛІГІЯ І МЕДЫЦЫНА

**Ратушнюк Юлія Валер’еўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

У дадзенай працы было разгледжана зараджэнне медыцыны ў кантэксце розных рэлігій, высветлена, як змянялася ўзаемадзеянне рэлігіі і медыцыны на працягу іх існавання. Таксама быў вывучаны ўплыў некаторых рэлігійных абрадаў на фізічнае здароўе чалавека.

*Ключавыя словы: рэлігія, медыцына, зараджэнне, уплыў, узаемадзеянні, культура, анатомія, лячэнне, малітва, збавенне.*

## RELIGION AND MEDICINE

**Ratushnyuk Yulia Valeryevna,Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor – senior ecturer Ratynskaya N. V.*

In this paper, the origin of medicine in the context of various religions was considered; it was clarified how the interaction of religion and medicine changed throughout their existence. Also, the influence of some religious rites on the physical health of a person was studied.

*Keywords: religion, medicine, origin, influence, interaction, culture, anatomy, healing, prayer.*

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца разгляд ўзаемадзеяння рэлігіі і медыцыны, пачынаючы з этапа іх фарміравання да цяперашняга часу.

Для гэтага трэба выканаць некаторыя задачы:

1. Разгледзець зараджэнне медыцыны ў кантэксце розных рэлігій.
2. Вывучыць уплыў рэлігійных абрадаў на фізічнае здароўе чалавека.
3. Высветліць, як змянялася ўзаемадзеянне рэлігіі і медыцыны на працягу іх існавання.

Медыцына ва ўсе часы была цесна звязана з рэлігіяй. І гэта не выпадкова, паколькі і рэлігія і медыцына стаяць ля вытокаў жыцця і смерці, а клопат аб чалавечым здароўі– душэўным і цялесным – спрадвеку з'яўляецца важнай функцыяй рэлігіі. Першабытныя лекары засноўвалі сваю дзейнасць на здагадках аб звышнатуральных вытоках хваробы, тлумачачы нездароўе ўздзеяннем злых духаў. Таму лячэнне складалася з разнастайных складаных рытуалаў: магічных загавораў, замоў, спеваў.

У старажытных культурах – егіпецкай, вавілонскай, шумерскай, грэчаскай – здольнасць лячыць сведчыла аб«чароўнай» выбранасці чалавека і вызначала яго, як правіла, жрэцкае становішча ў грамадстве. Напрыклад, першы егіпецкі лекар Імхатэп быў жрацом, а пасля быў абагаўлёны. Храм у яго гонар быў адначасова і шпіталем і медыцынскай школай. Медыцынская практыка была выключным правам чараўнікоў Персіі і брахманаў Старажытнай Індыі. Даследчыкі мяркуюць, што бацька Гіпакрата быў адным са жрацоў храма Асклепія – бога лекавання ў старажытных грэкаў. Абрад ахвярапрынашэння даваў некаторыя ўяўленні пра анатомію жывёл: анатомія чалавека не існавала як навука, беручы пад увагу абрадавыя забароны– дакранацца да памерлага, не кажучы ўжо пра ўскрыццё трупа.

У Бібліі вельмі мала спасылак на анатамічныя і фізіялагічныя факты. У біблейскія часы натуральных прычын хваробы нават не шукаюць, акрамя тых, якія відавочныя: раненні, падзенні, старэнне і слепата пры старасці. Аднак у любым выпадку лічыцца, што хвароба падараваная богам за грахі ці як выпрабаванне і вылечваць спачатку трэба душу.

Некаторыя даследчыкі ўстанавілі, што ў Каране змяшчаецца больш за 40 аятаў, звязаных з медыцынай. Каран нясе інфармацыю аб цяжарнасці і

бясплоднасці, грудным гадаванні дзяцей, прычынах і паходжанні хваробы. Каран перасцерагае ад пераядання і незбалансаванага харчавання.

Многія рэлігійныя культавыя прадпісанні таксама спрыяюць захаванню здароўя чалавека. У большасці рэлігій дазваляецца ўстрыманне ад паста хворым і саслабленым людзям. Забараняецца ўжыванне ў ежу мяса з крывёю, свініны. Рытуальныя абмыванні спрыяюць гігіене і прафілактыцы інфекцыйных захворванняў.

Рытуальныя рухі цела ўмацоўваюць сардэчную мышцу і паляпшаюць цыркуляцыю крыві, эластычнасць сухажылляў і звязак.

Першыя лячэбніцы адкрываліся пры храмах і манастырах. Нават слова «лазарэт» абавязана сваім паходжаннем рэлігіі - бо так называліся прытулкі для пракажоных, якія ствараліся па ініцыятыве манаскага ордэна Святога Лазара, заснаванага крыжакамі. Але ў сярэднія вякі царква замінала развіццю медыцыны. Апалагеты рэлігіі супрацівіліся ўкараненню ў практыку такіх адкрыццяў як вакцынацыя супраць воспы, пераліванне крыві, наркоз.

Пазней асноўнай арганізацыйнай формай узаемадзеяння медыцыны і рэлігіі былі бальніцы пры манастырах, напрыклад, пры Кіева-Пячэрскім, Нова-дзявочым, Пафнуціева-Бароўскім і многіх іншых.

Пазней з’явілася некалькі форм супрацоўніцтва, у якім вядучае месца належала суполкам сясцёр міласэрнасці. Таксама захоўваюцца бальніцы пры манастырах, узнікаюць храмы пры лячэбных установах, дзе святары займаліся пастырскім душ, пастырствам у шпіталях дзеючай арміі.

У савецкі час не было знешніх праяў узаемадзеяння, але напэўна святары наведвалі ў шпіталях хворых людзей, а людзі маліліся аб здароўі для сябе і сваіх блізкіх.

Аднак па гэты дзень сур'ёзны ўплыў могуць мець розныя рэлігійныя перакананні на спосабы, з дапамогай якіх атрыманы новыя медыцынскія метады і тэхналогіі. Вельмі пазітыўныя інавацыі з пункту гледжання навукі і медыцыны часта рэлігіяй сустракаюцца ў штыкі. Напрыклад, калі дактары ў еўрапейскіх краінах пачалі праграмы прышчэпак у XIX стагоддзі, многія рэлігійныя групы былі крытычна настроены ў адносінах да спосабу, якім гэта рабілася, таму штогэта моцна нявечыць чалавечыя целы, а яны, на іх думку, былі створаны па вобразу і падабенству Бога. Калі глядзець на ўсё з пазіцыі сучаснасці, то вялікія спрэчкі паміж медыцынай і рэлігіяй у наш час сустракаюцца з нагоды трансплантацыі органаў. Хоць гэтая адважная і небяспечная медыцынская працэдура ўвасабляе ўсе дасягненні сучаснай навукі, яна катэгарычна не вітаецца ў любой рэлігіі.

Асаблівай увагі ва ўзаемаадносінах рэлігіі і медыцыны заслугоўвае іншы факт - стаўленне да ўсіх медыцынскіх працэдур прадстаўнікоў Сведкі Іеговы. Іх цвёрдыя рэлігійныя перакананні цалкам выключаюць магчымасць пералівання крыві. Нярэдка ў медыцынскай практыцы падобныя паводзіны прыхільнікаў гэтай рэлігіі прыводзілі да сур'ёзных скандалаў паміж медыкамі, якія імкнуцца ўсімі сіламі дапамагчы пацыенту, і Сведкамі, якія стаяць катэгарычна супраць падобных маніпуляцый. У пэўным сэнсе гэта абцяжарвае аказанне практычна любой сур'ёзнай медыцынскай дапамогі.



Рэпазіторый БДМУ

Такім чынам, і зараз многія пытанні медыцыны супярэчаць канонам мноства рэлігій, а многія рэлігіі, у сваю чаргу, катэгарычна адмаўляюцца прымаць некаторыя вельмі неабходныя медыцынскія прадпісанні і аперацыі. Але з развіццём чалавецтва вострыя куты паміж рэлігійнымі перакананнямі і дасягненнямі медыцыны згладжваюцца, што прывядзе да агульнай мэты ў выглядзе захавання дару Божага – чалавечага жыцця.